Иными словами, трудно в Беларуси жить и трудящимся, и пенсионерам, и тунеядцам. Особенно «тунеядцам», которым удается доживать до старости.

Что бы ни говорили о белорусах, они всегда отличались способностью к сотрудничеству с официальными организациями. И коль есть такая возможность, всегда работают. Но даже в самых высокоорганизованных обществах есть «бездельники», которые предпочитают жить «нестяжателями», ограничивая свои доходы минимумом. В основном это явление возрастное. Как случилось некогда с хиппи, которые со временем пересмотрели свое отношение к государству и были ассимилированы его структурами.

В этом случае надо говорить не столько о социально-экономическом, сколько о культурном феномене, своеобразном андеграунде, протестующем против неконтролируемого потребления гламуром. Против лицемерия, по канонам которого нувориши хотят представить себя «благородными донами». Например, некая дама, которая служит в должности главного банкира страны, убеждает публику, что жить надо в самоограничении, экономить даже на сезонной обуви, как это делает она.

В итоге не получается ни дамы, ни банкира. На какую должность ее не определи, она остается обычной теткой, выросшей «в голоде и холоде». Перед которой вдруг открылся гламур.

Проблема, однако, есть. Как и всякая экономическая система, белорусская модель потребляет то количество ресурсов, которое может эффективно использовать. В том числе и рабочей силы. Чтобы увеличить ее потребление, надо обеспечивать реальный экономический рост. В этом случае повысится конкуренция на рынке труда, на который придут 90% всех «тунеядцев».

У нас же все переносится в сферу «идеологии» и милицейских ужесточений. То есть в манипулятивную пропаганду, которая опирается на административный произвол. С одной целью — увековечить существующий режим, отстранив общество от участия в решении его насущных проблем.

Все остальное — пустое кликушество, адресованное старухам-пенсионеркам.

Аномалия-2014

В постсоветских государствах в качестве носителя имперского сознания выступает не русский, а советский человек. Об этом необходимо помнить при анализе реакции белорусов на события в Украине.



Сергей НИКОЛЮК, эксперт НИСЭПИ

Во времена брежневского застоя вошло в моду присваивать персональные имена годам пятилеток. Народ инициативу партии и правительства воспринял как очередной повод для анекдотов. Ограничусь одним.

Диалог в вытрезвителе:

— Фамилия?

— Не помню.

— Имя?

— Не помню.

— Год рождения?

— Решающий.

А кто из читателей «Абажура» помнит, что в новогоднем обращении Лукашенко 2013 г. был назван «переломным для экономики»? А напрасно. Год с несчастливым номером таковым и оказался, т. к. двузначный рост реальной заработной платы в сентябре сменился падением.

Основываясь на столь решительном развороте важнейшего для населения макроэкономического показателя, автор этих строк высказал предположение, что к концу года электоральный рейтинг главы государства заметно снизится. Декабрьский опрос НИСЭПИ прогноз подтвердил: за четвертый квартал рейтинг потерял 7,8 пункта (сентябрь — 42,6 %, декабрь — 34,8 %).

Первый блин инициаторов присваивать годам персональные имена вышел комом. Тем не менее новогодний почин получил продолжение, и предпоследний год четвертой пятилетки в Беларуси решено было официально объявить «Годом гостеприимства». Понятно, что выбор в пользу гостеприимства был сделан в связи с проведением в Минске Чемпионата мира по хоккею в мае 2014 г.

Приведу первый абзац указа № 537 от 27 декабря 2013 г.: «В целях развития туризма, создания современной туристической инфраструктуры, учитывающей географическое положение, природные, исторические и культурные богатства Республики Беларусь, воспитания у граждан патриотической гордости и уважения к Отечеству постановляю…»

Однако в логике декабрьского падения рейтинга предстоящий год следовало бы назвать «Годом утраченных иллюзий». В пользу данного предложения решительно высказалось белорусское правительство, запланировавшее рост зарплаты в 2014 г. в пределах 3 %.

Тут требуется пояснение. За «нулевые» годы белорусов приучили к двузначному росту личного благосостояния. К хорошему, как известно, привыкают быстро. Стоит ли после этого удивляться, что двузначный рост зарплат и пенсий стал восприниматься большинством соотечественников в качестве основной характеристики стабильности. Желающих испытывать патриотическую гордость и уважение к Отечеству за однозначный рост личного благосостояния сегодня найти не так-то просто.

Поэтому не надо было обладать талантом Нострадамуса, чтобы, глядя на жалкие 3 %, предсказать дальнейшее снижение рейтинга главы государства в 2014 г., что и было автором проделано в статье «Совет министров решил обрушить рейтинг Лукашенко».

Все логично, если бы не одно «но»

Практика — критерий истины. Год подошел к концу. Доморощенный предсказатель попал пальцем в небо, и это при том, что правительство также ошиблось в своем прогнозе. Вместо жалкого роста заработной платы труженики республики получили ее падение за январь-сентябрь на 0,8 % (пусть читатель сам решит, какое прилагательное следует использовать в данном случае).

А как же рейтинг? Он отказался изменяться в соответствии с многолетней логикой и начал расти (см. табл.) Но это — по данным НИСЭПИ. По

информации, неоднократно озвученной в октябре самим рейтингоносцем, уровень его электоральной поддержки достиг 90 %[1]!

Динамика электорального рейтинга Лукашенко

09'13	12'13	03'14	06'14	07'14	09'14
42,6	34,8	39,8	39,8	38,9	45,2

Таким образом, уходящий год можно смело назвать «Годом электоральной аномалии». Причины аномалии следует искать в украинских событиях. Вот как, например, это делает «БелГазета»: «Избиратель отдает предпочтение не форме усов, толщине предвыборной программы или цвету полосочек на ленточках. Для него все познается в сравнении, в нашем случае — с Украиной. Тут зарплату платят — там задерживают, сокращают или облагают добровольно-принудительными налогами на военно-патриотические нужды. Тут худо-бедно что-то дают — там в основном отбирают, от бизнесов до конфискуемых в зоне АТО авто и микроволновок. Тут бедненько, зато чистенько — там темпы инфляции и роста цен на ЖКУ превышают уровень тутэйших страхов. Там стреляют — тут не стреляют (существенная разница!). Нормальный выбор нормального обывателя — за стабильность, против насилия и беспредела».

Вроде бы все логично, если бы не одно «но». Нерациональное поведение белорусов (рост поддержки главы государства на фоне снижения доходов) автор цитаты объяснил их… рациональностью.

Рациональность — главная характеристика современного европейского человека. Так, может, прав был Лукашенко, трижды в интервью «Евроньюс» использовавший словосочетание «мы европейцы»?

Подобного взгляда на причину Аномалии-2014 придерживаются практически все независимые белорусские аналитики. Единственное исключение — автор этих строк.

«Крым — это кодовое слово»

Для пояснения своего аномального взгляда на Аномалию-2014 следует напомнить читателям, что белорусское общество, как и общество российское, может находиться в двух состояниях: политической апатии и политического возбуждения.



В отличие от НИСЭПИ, проводящего опросы раз в квартал, российские социологические службы имеют возможность работать в еженедельном режиме. Такая оперативность позволяет отслеживать реакцию российского общества на конкретные события практически в online-режиме.

И что же мы имеем? Мы имеем нулевую реакцию на Майдан и на Олимпийские игры в Сочи. Последний факт будет интересен для тех,

[1] Отыскать источник, готовый взять на себя ответственность за столь высокий уровень электоральной поддержки Лукашенко, автору не удалось. Наиболее дотошным читателям поясню, что на волне кампании «Крым наш!» электоральный рейтинг президента России Путина, по данным прокремлевского Фонда общественного мнения, выше 72 % не поднимался.

кто наивно полагает, что из Чемпионата мира по хоккею Лукашенко мог извлечь электоральные дивиденды.

Иными словами, нормальный российский обыватель, если воспользоваться терминологией «БелГазеты», отказался делать нормальный выбор в пользу стабильности, против насилия и беспредела. Ни «огненное кольцо» на Майдане, ни расстрел «небесной сотни» не вывели его из состояния политической апатии. Но если мы сравним между собой значения социальных индексов по состоянию на начало и на конец марта, то у нас сложится впечатление, что речь идет о разных обществах.

Дела в стране идут сегодня в целом в правильном направлении, или страна движется по неверному пути? (в процентах от числа опрошенных)

Вариант ответа	01’14	02’14	03’14	04’14	05’14
Дела идут в правильном направлении	43	47	60	58	60
События ведут нас в тупик	41	37	26	26	23
Индекс правильности курса*	2	10	34	32	37

***Разность между позитивными и негативными оценками**

Разумеется, никакая причина заменить (кардинально изменить) российское общество за столь короткий срок не могла. Для реальных социальных изменений требуются сроки, измеряемые поколениями. Но, как и в случае с конкретным человеком, переход миллионов из состояния апатии в состояние возбуждения может произойти практически мгновенно. Был бы подходящий повод.

И такой повод нашелся. Для его описания мне потребуется помощь российского политолога Владимира Пастухова: «Крым — это кодовое слово в русской исторической памяти. Потеря Крыма — один из самых глубоких рубцов, возникших в народном подсознании после распада советской Империи. В этой точке сходится бесчисленное количество оголенных нервов русского мира. Горечь от потери Крыма находится за пределами рационального восприятия и живет практически в каждом русском сердце. Поэтому Путин не просто послал войска в Крым. Он повернул ключ зажигания в национальном подсознании, мгновенно введя население огромной страны в состояние аффекта. Как только были произнесены сакральные слова “Крым” и “война”, в душах десятков миллионов людей включился “основной инстинкт” и раздался “рев племени”. И теперь этот “рев племени” стал объективным фактором, определяющим общественно-политическую обстановку в стране».

Рекомендую последнее предложение перечитать еще раз. Событие, обозначаемое сегодня как «Крым наш!», изменило представления россиян о реальности (строго говоря, человек всегда реагирует не на реальность, а на свои представления о ней). Для иллюстрации данного утверждения прибегну к помощи еще одной таблицы, позаимствованной на сайте Левада-Центра.

На протяжении 2013 г. индекс правильности курса отклонялся от нулевого значения на 1–2 единицы. В феврале он подрос (опрос проводился в конце месяца), а в марте подпрыгнул. В августе был зафиксирован исторический максимум — 42 единицы!

Левада-Центр ежемесячно фиксирует целый букет социальных индексов, и все они после аннексии Крыма повели себя аналогичным образом.

«Решение крымского вопроса, — отмечает эксперт Левада-Центра Мария Красильникова, — вызвало небывалый прилив социального оптимизма, основанного на стремительном росте надежд на эффективность верховной власти».

В переводе с языка профессиональных социологов на язык повседневности это означает, что рейтинг президента Путина начал стремительно расти. И в качестве причины роста выступил не страх потери стабильности, а массовая эйфория (социальный оптимизм).

Альфа и омега белорусской модели

Все описанное выше означает победу иррационального начала над рациональным. Но это в России. А в Беларуси? Если согласиться с моими оппонентами, коим нет числа, то следует признать, что одно и то же событие (единая его трактовка российскими СМИ) сгенерировало у двух братских народов противоположные чувства: у россиян — эйфорию, у белорусов — страх.

Поверить в подобное расхождение мне сложно, и ссылки на русский империализм звучат неубедительно. На бескрайних просторах СНГ сегодня в качестве носителя имперского сознания выступает не русский, а советский человек. Но откуда следует, что его концентрация среди родных осин принципиально отличается от концентрации среди осин российских?

Согласно культурологу Игорю Пелипенко, к числу базовых признаков имперского сознания в первую очередь следует отнести последовательный этатизм (от фр. État (государство) — мировоззрение и идеология, абсолютизирующие роль государства в обществе). За примерами в Беларуси далеко ходить не требуется. Открываю последнее (на момент написания статьи) выступление Лукашенко: «Всех (руководителей банков. — *С. Н.*) подстричь под одну гребенку. И тогда, если и плохо будет, мы народу сможем объяснить. Плохо? Плохо всем. Это не мелкий вопрос. Как оказывается, он в 15–17 % выливается при стоимости кредитных ресурсов наших банков. Притом не глядя ни на белорусские банки, ни на

российские, ни на зарубежные — всех подстричь под одну гребенку»[2].

Безоговорочное подчинение интересов отдельного человека интересам государства — это альфа и омега белорусской модели. Мне известно лишь одно исключение из этого правила. Полагаю, и для читателей «Абажура» оно не является тайной.

Аннексия Крыма и последующее открытое противостояние Западу компенсирует носителю имперского сознания убожество частной жизни: зависимость, бедность, беспомощность перед государственным произволом. Гражданство носителя имперского сознания при этом особой роли не играет.

Два десятилетия, прошедшие после распада советской империи, не привели к заметному снижению популяции советского человека. «Я уже много раз подчеркивал: никакие компьютеры, мобильные телефоны, пирсинги и прочее не в силах существенно изменить менталитет молодого поколения, которое следует стародавним образцам поведения, хотя внешне почти неотличимо от западных сверстников. В России даже интернет не способствует приобщению к либеральным веяниям и современному мышлению, а выступает порой средством распространения самой вздорной и реакционной идеологии, на которую молодые клюют довольно охотно». Это — Лев Гудков, директор Левада-Центра.

В Беларуси регулярно интернетом пользуется около 60 % взрослого населения, что не мешает абсолютному большинству респондентов (от 60 до 65 %) разделять взгляды российских телеканалов на украинские события (НИСЭПИ).

В России сторонников таких взглядов на 15–20 % больше. Можно ли в этой разнице в пользу «старшего брата» находить повод для оптимизма, не знаю. Это дело вкуса. Но в любом случае мы наблюдаем массовый возврат к архаическим и примитивным в своей основе представлениям. Именно на них основаны сегодняшние механизмы консолидации — через образ врага, через очень сильный рост негативизма ко всем, кто не высказывает симпатий к власти.

Культ Победы

Между прочим, еще до получения результатов мартовского опроса НИСЭПИ, который был проведен в конце месяца (важная деталь!), слом предыдущих трендов был предсказуем. Все дело в том, что нынешняя аномалия является своеобразным ремейком сентября 2008 г.

Напомню читателям, что месяцем ранее Россия провела маленькую победоносную войну



в Грузии. Все, что мы наблюдаем сегодня, имело место и шесть лет назад: рейтинг Лукашенко, социальные индексы и желание объединяться с Россией пошли вверх, а желание интегрироваться с Европой — вниз.

О возврате к архаичным представлениям я уже говорил выше. Культ Победы — один из самых древних. Своими корнями он уходит в догосударственные времена и догосударственную культуру. Поэтому для белорусов ни одно из событий XX века не может сравниться по своей значимости с Великой Отечественной войной. Отсюда постоянные рассуждения Лукашенко о «нашей Победе», которую «мы никому не отдадим».

Маленькой победоносной войне соответствовал кратковременный мобилизационный эффект. Опрос, проведенный в декабре 2008 г., зафиксировал возвращение белорусского общества в исходное состояние. Как долго продлится нынешняя аномалия — вопрос открытый. Первые признаки ее исчерпания уже фиксируют российские социологи.

[2] Отчет правительства, Национального банка о работе экономики за 2014 г. и прогнозе на 2015 г. (11 ноября 2014 г.).



Святлана
ГАЛОЎКІНА

Вечэрні
газета, дзе ёсць

Прызы атрымліваць заўсёды прыемна. Тым больш, калі яны неспадзяваныя. Сапраўды, паездка ў Мінск на падвядзенне вынікаў конкурсу «Найлепшая рэгіянальная газета-2014», фундатарам якога выступае Асацыяцыя выдаўцоў рэгіянальнай прэсы, не абяцала сюрпрызаў. Хаця з вечара было вядома, што першае месца ў намінацыі «Фотажурналістыка» прысуджана карэспандэнту нашай газеты Аляксандру Чугуеву, з якім мы і адправіліся па ўзнагароду.

Якім жа было здзіўленне, калі разам з дыпломам па фотажурналістыцы наша «вячорка» атрымала яшчэ два першыя месцы ў намінацыях «Найлепшая сацыяльная акцыя газеты» і «Культура», ды яшчэ была прызнана лепшым рэгіянальным выданнем гэтага года! Безумоўна, нашы журналісты заслужылі тую перамогу. Аднак спецыяльна для гэтага ў рэдакцыі нічога не рабілася — мы проста штодня выконвалі сваю справу і стараліся, каб наша інфармацыя была аб'ектыўнай, цікавай і разнастайнай.

…Калі 14 гадоў таму выйшаў першы нумар «ВБ», мала хто мог дакладна сфармуляваць не толькі мэты і задачы выдання, але і адказаць на пытанне, навошта ўвогуле ўсё гэта робіцца. Зразумела, было жаданне самарэалізавацца ў абранай прафесіі, хацелася атрымліваць годную зарплату і, што называецца, набыць адпаведны сацыяльны статус, зарабіць аўтарытэт. Журналіст усё ж такі асоба публічная, і менавіта гэта вабіць многіх маіх калег.

Сёння я магу сказаць, што бабруйская «вячорка» займае сярод мясцовых СМІ асаблівую нішу. Гэта, што называецца, газета «з чалавечым аблічча», якая імкнецца быць карыснай для сваіх чытачоў і дапамагае ім вырашаць самыя розныя праблемы.

Канечне, былі перыяды, калі рэдакцыя рызыкавала ператварыцца ў філію ЖКХ альбо мясцовую службу выратавання. Аднак праз усё гэта трэба было прайсці, каб зразумець, што вельмі часта без умяшання журналістаў праблемы, з якімі да нашага выдання звяртаюцца бабруйчане, вырашыць амаль немагчыма.

Так было і са Святланай Якаўлевай, гераіняй адной з публікацый, якая з прычыны абмежаваных фізічных магчымасцяў з самага дзяцінства вымушана была праводзіць цэлыя дні ў кватэры. У сям'і проста не было сродкаў, каб набыць для яе сучасную інвалідную электракаляску. Аднак дзякуючы публікацыі на старонках нашай газеты і на просьбу пра дапамогу адгукнуліся не толькі гарадскія прадпрыемствы, але і прыватныя асобы. Цяпер дзяўчына самастойна перасоўваецца па горадзе, сустракаецца з сябрамі і адкрывае для





Бобруйск
што пачытаць



сябе той дзівосны свет, пра які да нядаўняга часу мела даволі сціплае ўяўленне. Менавіта гэты артыкул прынёс газеце адно з прызавых месцаў на конкурсе рэгіянальных выданняў. Што гэта — шчаслівы выпадак ці заканамернасць? Мне цяжка адказаць. Аднак калі верыць у нейкія вышэйшыя сілы, у справядлівасць, то ніводная добрая справа не знікае бясследна, не застаецца без увагі і вяртаецца дабром. Нават без усялякіх грамат і прызоў, а цёплымі, шчырымі, удзячнымі словамі звычайных людзей.

Як сёння жывецца рэгіянальнай газеце? Тыя, хто мае дачыненне да журналісцкай дзейнасці, ведаюць, што зусім няпроста. За магчымасць заставацца самімі сабой даводзіцца ахвяраваць спакойным жыццём, камфортам і нават фінансавым дабрабытам. Пры гэтым мы не лічым сябе апазіцыяй, да якой прынята прыпісваць усе недзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Больш за тое, журналістам выдання забаронена на старонках газеты выказваць свае суб'ектыўныя погляды па пытаннях, у якіх яны не з'яўляюцца экспертамі. За іх гавораць героі публікацый, а майстэрства журналіста і яго прафесіяналізм палягаюць у тым, каб знайсці такіх людзей і пазнаёміць іх з нашымі чытачамі.

Зразумела, што сёння ў «вячоркі» хапае праблем, якія тычацца не толькі ўнутранай палітыкі рэдакцыі і фінансаў. Аднак мы імкнёмся да таго, каб рабіць якасны медыйны прадукт, які б балансаваў паміж неабходнасцю зарабляць грошы і даваць людзям вычарпальную інфармацыю. Шмат гадоў таму мы выходзілі пад дэвізам: «Газета, дзе ёсць што пачытаць». Гэты рэкламны слоган даўно ўжо знік са старонак выдання, бо сёння кожны бабруйчанін ведае, што калі трэба набыць газету для душы, а не дзеля тэлепраграмы і аб'яваў, то трэба купіць «вячорку».

Думаю, што неўзабаве значная частка нашых чытачоў будзе аддаваць перавагу інтэрнэт-версіі выдання. З цяжкасцямі арганізацыі працы ў электронным фармаце сёння сутыкаюцца ўсе без выключэння сродкі масавай інфармацыі, і не толькі ў Беларусі, але і ва ўсім свеце. Кожная рэдакцыя выбірае свой уласны стыль пры падрыхтоўцы інфармацыі, і зараз наша задача — знайсці такі варыянт, які б дазволіў не толькі захаваць, але і памножыць аўдыторыю нашых прыхільнікаў. Канечне, зрабіць гэта не так проста з улікам таго, што кожны дзень трэба дбаць і пра больш «зямныя» справы накшталт таго, як зарабіць дастаткова грошай, каб аплаціць паслугі друкарні, купіць паперу, забяспечыць заробак журналістам. Тым не менш наш сайт сярод гарадскіх СМІ, якія таксама выходзяць у друкаванай версіі, мае самую вялікую колькасць наведвальнікаў.

Калі калегі з іншых выданняў даведаюцца пра тое, што многія нашы журналісты не працяраюць днямі штаны ў рэдакцыі і збіраюцца разам толькі зранку, то гэта выклікае даволі цікавую рэакцыю. Нехта ставіцца да такой працы са здзіўленнем, нехта зайздросціць. Вельмі важна, што ў «вячоркаўцаў» ёсць поўная свабода творчасці, за што мы ўдзячныя нашаму рэдактару Наталлі Сысой. І калі да мяне, напрыклад, прыходзіць натхненне, то я магу сабе дазволіць праседзець за камп'ютарам да «першых пеўняў» і не турбавацца, што з самага ранку трэба з'явіцца ў рэдакцыі. Аднак існуе даволі жорсткі дэдлайн, і крый Божа камусьці з журналістаў яго праігнараваць!

З такой дакладнай арганізацыяй працы асабіста мне даводзілася сутыкацца ў многіх расійскіх і ўкраінскіх СМІ, дзе журналістыка ўжо даўно цесна пераплялася з бізнесам і страціла свой творчы складнік. Разам з даверам чытачоў, бо інакш не бывае.

Таму на гэткім фоне нават самыя складаныя праблемы адыходзяць на другі план, і застаецца галоўнае — жаданне працаваць і атрымліваць ад гэтага задавальненне.

Фота Аляксандра Чугуева



Рэдакцыя «ВБ»

Сяргей ШАПРАН

Музеі Васіля Быкава

Да 90-годдзя Васіля Быкава, якое адзначалася ў чэрвені, выйшлі не толькі першая кніга 10-га тома Поўнага збору твораў пісьменніка ды непадцэнзурныя выданні яго знакамітых аповесцей «Мёртвым не баліць» і «Ліквідацыя» («Сотнікаў»), — у Ждановічах быў створаны Музей-дача Васіля Быкава. Мусіць, першы музей-лецішча ў Беларусі і ўжо чацвёрты музей Васіля Быкава ў свеце.



Васіль Быкаў нават і праз дзесяцігоддзе пасля сыходу застаецца адным з самых папулярных беларускіх пісьменнікаў. На карысць гэтага сведчаць не толькі апытанні чытачоў і яго новыя кніжныя выданні, якія з зайздроснай рэгулярнасцю выходзяць як на мове арыгінала, так і ў перакладах… Ждановічскі музей — гэта ўжо чацвёрты музей Васіля Быкава. Раней за яго ўзніклі Сядзіба-музей Васіля Быкава ў вёсцы Бычкі і недзяржаўны музей пісьменніка ў Гродне, а таксама Музей Васіля Быкава ва Украіне. У кожнага з гэтых музеяў свая гісторыя.

Украінскі музей існуе ў сяле Вялікая Севярынка, дзе зімой 1943–1944 гадоў ваяваў Быкаў, дзе ён быў цяжка паранены і ледзь не загінуў пад коламі фашысцкага танка, — яго імя доўгі час было ў спісе тых, хто загінуў, на мясцовым абеліску. Музей стварылі сельскія настаўнікі і школьнікі. Можна толькі пазайздросціць энтузіязму вялікасевярынкаўскіх жыхароў, якія ўжо даўно з апантанай любоўю да беларускага пісьменніка ладзяць музейную экспазіцыю і літаратурныя вечарыны, прысвечаныя Васілю Быкаву.


Што тычыцца бычкоўскага музея, дык ён узнік на месцы, дзе раней стаяла хата сям'і Быкавых і дзе ў 1930-я гады гадаваўся будучы класік айчыннай літаратуры. Гэтая хата была зруйнавана праз год пасля смерці Быкава — замест яе рашэннем Ушацкага раённага Савета дэпутатаў і распараджэннем Віцебскага аблвыканкама была пабудавана новая, якая мае даволі шмат адрозненняў ад арыгінала і пра якую сястра пісьменніка Валянціна Уладзіміраўна некалі сказала: «Хата мая як цэркаўка стала. Нават не пазнала яе». Экспазіцыя музея не дужа багатая, але тут ёсць рэчы, якія дасюль памятаюць Васіля Быкава, у тым ліку яго самы першы франтавы ліст да родных, чамадан, з якім будучы пісьменнік у 1957 годзе прыехаў з Далёкага Усходу, сямейны абраз ды прадметы хатняга ўжытку. У музеі няма навуковых супрацоўнікаў — раней яго наглядчыцай была жонка брата пісьменніка Антаніна Аляксандраўна, якая жыве побач, а цяпер там працуе яе сын Мікалай.

У гэтым сэнсе больш пашанцавала гарадзенскаму музею, які быў створаны найперш намаганнямі ветэрана вайны Мікалая Аляксандравіча Мельнікава. Дзякуючы спрыянню і падтрымцы жонкі пісьменніка Ірыны Міхайлаўны гэты музей літаральна напоўнены быкаўскімі рэчамі: кнігамі, фотаздымкамі, дакументамі, машынапісамі, рукапісамі, нарэшце, уласнымі рэчамі Васіля Уладзіміравіча. Але і тут існуе вялікая праблема: музей прыватны і месціцца ў цесным пакойчыку Гродзенскага гарадскога аб'яднання ветэранаў вайны, хоць імя Быкава і найбагацейшая музейная экспазіцыя вартыя асобнага вялікага памяшкання, тым больш, што з наднёманскім горадам звязаны больш за дваццаць гадоў жыцця пісьменніка.

У сваю чаргу ждановіцкі музей узнік найперш дзякуючы добраму памкненню Ірыны Міхайлаўны Быкавай і ініцыятыўнасці тагачаснага міністра культуры Паўла Латушкі, а таксама супрацоўнікаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры: музей створаны ў памяшканні сямейнага лецішча Быкавых, якое Ірына Міхайлаўна падаравала дзяржаве. Па сутнасці, гэта самы аўтэнтычны музей Быкава, бо ўсе рэчы тут ягоныя. Нават сама атмасфера — хутчэй за ўсё, не музейная, а дачная. Невялічкія экспазіцыі (копіі малюнкаў і машынапісаў пісьменніка, фотаздымкі і кнігі) даволі ўдала ўпісаны ў інтэр'ер лецішча і практычна не парушаюць агульнага ўяўлення пра адзін з адрасоў жыцця Васіля Уладзіміравіча. Праўда, і тут ёсць праблемы: знайсці музей (як, дарэчы, і музей у Бычках) даволі цяжка, бо ніякіх дарожных указальнікаў няма. Да таго ж зімой ён зачынены з банальнай прычыны халадоў, бо абагравацца звычайнай печкай.


Дадамо яшчэ, што цікавыя экспазіцыі, прысвечаныя Быкаву, ёсць у Музеі Максіма Багдановіча ў Гродне, у Віцебскім абласным краязнаўчым музеі і ў Гудзевіцкім літаратурна-краязнаўчым музеі; вялікая экспазіцыйная зала была да пачатку рамонту і ў Музеі гісторыі беларускай літаратуры. Але будзем спадзявацца, што гэта толькі пачатак і, нягледзячы на шматлікія праблемы, ва ўсіх гэтых музеяў наперадзе доўгае жыццё, якое будзе паступова наладжвацца — разам з асэнсаваннем, найперш на дзяржаўным узроўні, хто быў і хто ёсць Васіль Быкаў не толькі ў беларускай літаратуры, але і ў гісторыі краіны.

Мовай ультыматуму



Да гісторыі першай публікацыі аповесці «Ліквідацыя» («Сотнікаў») Васіля Быкава

Хрэстаматыйны «Сотнікаў» быў напісаны Васілём Быкавым у 1969 г., апублікаваны са шматлікімі купюрамі ў 1970-м і толькі праз 45 гадоў упершыню выдадзены без цэнзуры і пад аўтарскай назвай — «Ліквідацыя». Як і ў выпадку з іншай аповесцю Быкава — «Мёртвым не баліць», — гэта стала магчымым дзякуючы выдавецтву «МЕДЫЯЛ» і дабрачыннаму ўдзелу мецэната Паўла Бераговіча і журналіста Глеба Лабадзенкі.



Сяргей ШАПРАН

Да гісторыі цэнзуры «Ліквідацыі» («Сотнікава»)

Калі новая аповесць Васіля Быкава «Ліквідацыя» ў перакладзе на рускую мову і пад назвай «Сотнікаў» з’явілася на старонках расійскага часопіса «Новый мир», у рэдакцыі «Полымя» яшчэ толькі разважалі, ці варта яе друкаваць. За публікацыю твора катэгарычна выказаўся Янка Брыль, які пісаў у лісце да «палымянскага» сакратара Алеся Бачылы: «Аповесць В. Быкава пад назвай “Ліквідацыя” я прачытаў у студзені, цяпер пазнаёміўся з яе аўтарскім перакладам, надрукаваным у “Новом мире”. Я быў рашуча за друкаванне яе ў “Полымі”, хаця ў мяне і былі некаторыя заўвагі чыста мастацкага, не вельмі істотнага характару… Аповесць “Сотнікаў” — глыбокі, сумленны, таленавіты твор, і я, безумоўна, за тое, каб ён як мага хутчэй з’явіўся ў “Полымі”. Ненармальна гэта і брыдка, што такія творы з’яўляюцца раней у перакладзе…»

Аднак іншай думкі прытрымліваліся больш уплывовыя пісьменнікі таго часу — Максім Танк і Пятрусь Броўка. Іх лісты ў рэдакцыю «Полымя» красамоўна сведчаць пра тое, каму менавіта Быкаў «абавязаны» тымі зменамі ў аповесці, на якія яго прымусілі пайсці.

«Яшчэ раз уважна перачытаў я аповесць В. Быкава “Сотнікаў”, якая надрукавана ў часопісе “Новый мир”. Шкада, што не маю пад рукой першага яе варыянта са сваімі заўвагамі, каб зверыць усе аўтарскія праўкі. Адно трэба сказаць, што В. Быкаў дапрацаваў многія сцэны, скараціў многія спрэчныя і, на мой погляд, лішнія розныя філасофскія разважанні, якія былі ў першым варыянце.

Зараз аповесць чытаецца з большай цікавасцю, хоць і цяпер яна, напэўна, выкліча шмат заўваг чытачоў. Я — за тое, каб яе надрукаваць у часопісе “Полымя”, параіўшы аўтару крыху праясніць агульны фон, каб не такая фатальная “обреченность” ляжала на героях гэтай аповесці, і, можа, хоць у фінальнай сцэне паказаць галоўных віноўнікаў усёй трагедыі — фашысцкіх захопнікаў. Я не буду раіць, якія сюжэтныя хады можна было б зрабіць. Аўтар — пісьменнік вопытны. Яны яму відней. Тут можна прыгадаць розныя парады і патрабаванні, якія ў свой час рабіліся аўтару “Ціхага Дона”. У кожнага пісьменніка — свой падыход да мэты і яе выражэння. Але гутарка ідзе аб тым, каб не размінуцца з праўдай.

З нарачанскім прывітаннем

Нарач, 2 сакавіка 1970 г. *Максім Танк*».

«Аповесць Васіля Быкава “Сотнікаў” чытаецца з цікавасцю. Прачытаў я яе за адзіны дзень. Якое агульнае ўражанне. Калі я адлажыў аповесць і падумаў, — якое пачуццё яна ў мяне выклікала? Бясспрэчна, нянавісць да здраднікаў-паліцаяў, ну і, канечне, да немцаў, хоць іхнюю лютасць можна

было б паказаць больш. А то доўгі час яны наогул застаюцца па-за сцэнай.

Што б мне хацелася? Бачыць аповесць надрукаванай з некаторымі папраўкамі і дадаткамі, якія аўтару зрабіць было б не вельмі цяжка.

Па-першае, прынамсі ў парадку адступлення паказаць хоць бы адну падзею гераізму партызанаў. Хай бы яна звялася, скажам, да разгрому невялічкага гарнізона дзесьці ў воласці, у невялікім мястэчку. А то ўвесь час яны ўцякаюць (гэтыя Рыбак і Сотнікаў).

Па-другое. Вельмі прыкра, калі Рыбак вядзе Сотнікава на смерць. Можа, адзінкавы такі выпадак і быў, але гэта неўласціва нашаму партызанскаму руху. Можа, варта было б пазбегнуць гэтага, а калі не, дык было б добра, каб Рыбака (нягледзячы на яго пераход у паліцаі) усё роўна павесілі. А то выходзіць, што здрадніцтва, шкурніцтва перамагае…

Жнівень, 1970 г. *Пятрусь Броўка*».

Лісты былі зачытаны падчас чарговага «палымянскага» абмеркавання, пра якое Быкаў пазней распавядаў: «“Полымя” пачало татальнае “абмеркаванне” маёй творчасці. Мылілі мне галаву з асаблівым задавальненнем. Праводзілі паралелі з падрыўной дзейнасцю антысавецкіх радыёстанцый “Свабода” і “Голас Амерыкі”, абвінавачвалі ў здрадзе ідэалам сацыялізму і гэтак далей. Рабілася гэта, натуральна, з дапамогай маіх кніг. Нехта з вельмі пільных заўважыў: у творчасці Быкава, у яго аповесцях няма ніводнага камуніста… Ні благога, ні выдатнага. А я і не мог напісаць інакш, бо ў гады вайны ніхто на гэта не звяртаў асаблівай увагі. Гэта потым пачалі шукаць нейкую партыйнасць, а падчас баёў роля камісараў, палітрукоў, ваенных саветаў абсалютна нічога не значыла. Яны былі толькі сведкамі падзей і не болей. Уздымаць на шчыт палітработу сталі пазней, асабліва ў так званы брэжнеўскі перыяд».

Праз два дні пасля «палымянскага» паседжання прэтэнзіі да аўтара «Сотнікава» былі накіраваны ў пісьмовым выглядзе ў Гродна:

«*19 жніўня 1970 г.*

Паважаны Васіль Уладзіміравіч!

Як Вы папрасілі на паседжанні рэдкалегіі нашага часопіса, — пасылаем Вам асноўныя нашы заўвагі па Вашай аповесці “Сотнікаў”.

1. Хацелася б, каб Вы, калі можна так сказаць, праяснілі агульны фон аповесці: можа б, хоць у парадку адступленняў ці праз успаміны галоўных герояў паказалі адну-дзве падзеі гераізму партызан, каб мясцовыя паліцаі не адчувалі сябе “гаспадарамі” і г. д.

2. Ці не можна некалькі зняць з герояў фатальную “обреченность”, каб яна не ляжала ў іх увесь час на плячах. Добра было б, каб Сотнікаў у Вас хоць бы ў апошні час — пасля допыту і на плошчы — быў больш мужны і цвёрды, — ён жа “касцяк” усёй аповесці. Пажадана, каб Вы некалькі праяснілі яго разважанні ў тым плане, у якім гаварылася на паседжанні рэдкалегіі. (Сотнікаў думае: варты людзі ці не, каб за іх аддавалі жыццё; яго развагі пра адукацыю Рыбака і вышэйшы кодэкс чалавечнасці, пра біблію на матчыным камодзе і г. д.)

3. Можа, дзе больш падкрэсліць, што Рыбак — катэгорыя сацыяльная. Адсюль ясней стануць вытокі яго здрады.

4. Хацелася, каб Вы абавязкова паказалі больш галоўных віноўнікаў усёй трагедыі — фашысцкіх захопнікаў, а не мясцовую паліцыю: вядома, што паліцаі былі толькі фашысцкімі паслугачамі і г. д.

5. Ці трэба, каб стараста “круціўся між двух агнёў”, калі ён ідзе служыць да немцаў па заданні партызан.

6. Не хацелася б, каб людзі “праходзілі міма” Басі — Вашай гераіні, — калі яна хаваецца ад немцаў і паліцыі…

Просім Вас уважліва паставіцца да заўваг і тыя з іх, якія, на Вашу думку, слушныя, улічыць пры дапрацоўцы аповесці.

Друкаваць яе будзем, як толькі атрымаем ад Вас папраўлены рукапіс.

Па даручэнні рэдкалегіі: *П. Кавалёў*
І. Пташнікаў».

Гэта гучала як ультыматум: друкаваць аповесць будзем, як толькі атрымаем *папраўлены* рукапіс.

Літаратурны анекдот

«Дапамогу аўтару ў дапрацоўцы было вырашана даручыць Барысу Сачанку. Сказалі, каб з тым не цягнуць, — прыгадваў у «Доўгай дарозе дадому» Васіль Быкаў. — Адразу пасля паседжання рэдкалегіі, яшчэ пакуль не прастылі свежыя ўказанні, мы з Сачанкам пайшлі да яго на кватэру. Там Барыс мне сказаў, што не п’е, таму і мне не раіць, бо рэдагаваць трэба з цвярозай галавой — справа сур’ёзная. Я ўжо меў вопыт Сачанкавай рэдактуры, калісь яго намаганнямі была амаль цалкам перапісана мая невялічкая аповесць “Здрада”. Цяпер мне Барыс па-сяброўску адкрыў сакрэт рэдактарскіх закідаў да аповесці — адсутнасць у ёй вобразаў камуністаў. Я сказаў, што наогул пазбягаю тых вобразаў, бо не валодаю патрэбным талентам. Мабыць, для іх увасаблення патрэбны талент кшталту Салтыкова-Шчадрына, а ў мяне, калі і ёсць, дык іншы. Сачанка сказаў на тое, што ён гэта выправіць у адзін момант і, пагартаўшы рукапіс, знайшоў здатнае месца. Во тут і напішам: Сотнікаў — камуніст. А што, апроч таго, і сын камуніста, тое вынікае з кантэксту».

Сапраўды, у машынапісе аповесці, у 16-м раздзеле, у прыватнасці, у сказе: «Праўда, за

пяць партызанскіх месяцаў ён нешта зрабіў для свайго абавязку грамадзяніна і байца» Васілём Уладзіміравічам дапісана алоўкам: «і камуніста». Сябар Быкава паэт Генадзь Бураўкін сведчыў падчас нашых з ім гутарак: «Калі вопытны Барыс Сачанка прапанаваў недзе ў тэксце абазначыць Сотнікава як камуніста, Васіль пасля спытаў, як я пастаўлюся да гэтага, таму што сам ён вагаўся. Я адказаў у тым сэнсе, што, можа, для выратавання твора і варта пайсці на такі кампраміс, каб потым, у пазнейшых публікацыях, зняць яго. Мне здавалася, што ў агульным кантэксце гэта будзе не так істотна. Пасля, у публікацыі ў "Полымі", я нават не правяраў, ці даў Васіль згоду на гэту Сачанкаву прапанову, ці не, паколькі мне і цяпер абсалютна не важна — настаўнік Сотнікаў ці, напрыклад, урач, бо яго постаць, яго вобраз — выдатнае мастакоўскае дасягненне ў літаратуры».

Быкаў прыгадваў, што пасля таго, як Сотнікаў «стаў» камуністам, прэтэнзій да аповесці больш не было: «Хоць мы нічога больш не змянілі, у тым выглядзе аповесць пайшла ў набор. Прэтэнзіяў да яе больш не знайшлося ні ў галоўнага — Паўла Кавалёва, ні ў Галоўліце, ні ў ЦК. Што значыць мудры спрактыкаваны рэдактар! Толькі аўтар пры гэтым адчуваў сябе дурнем, ну але гэта яго прыватная справа». А між тым прэтэнзіі насамрэч былі — толькі па цэнзурных меркаваннях тых прэтэнзій было каля ста. Дарэчы таксама будзе сказаць, што ў «расійскім» варыянце аповесці Сотнікаў — хоць гэта і падобна да літаратурнага анекдота — і дасюль застаецца не камуністам. У арыгінале па-беларуску ён зноў стаў беспартыйным толькі цяпер — пасля выхаду непадцэнзурнай рэдакцыі твора.

Пад наглядам цэнзуры

«Сотнікаў» быў надрукаваны ў 11-м нумары «Полымя». Быкаў паведамляў у гэтай сувязі расійскаму крытыку і сябру Лазару Лазараву: «Что ж, пишу, как умею, как понимаю, хотя, разумеется, надо бы много лучше. Но я рад, что и это удалось, хотя с купюрами, с *не моим* названием. В Минске идет только в № 11 "Полымя", и то после длительных проработок автора на двух редколлегиях».

Сапраўды, гэты варыянт істотна адрозніваўся ад ранняй рэдакцыі аповесці. Да прыкладу, у 2-м раздзеле аўтар (дарэчы, выпускнік Саратаўскага артвучылішча) выносіць жорсткі прысуд сістэме вайсковага навучання: «Уся яе [артылерыйскай батарэі. — *С. Ш.*] шматгадовая вывучка ў вядзенні агня з закрытых пазіцый, усе матэматычныя тонкасці яе камандзіраў пайшлі насмарку, як толькі стрэліся з ворагам», — аднак у пазнейшай рэдакцыі гэты сказ адсутнічае. Таксама быў перароблены Быкавым, відаць, з самацэнзурных меркаванняў, наступны фрагмент: «…гарматныя разлікі, гатовыя паказаць ворагу агнявую сілу сваіх гармат. І напэўна паказалі б, калі б абставіны склаліся так, як гэта прадугледжана ў шматлікіх статутах і настаўленнях, выпрацаваных на аснове навукі і практыкі папярэдніх войнаў». У пазнейшай рэдакцыі ён выглядае зусім інакш: «…гарматныя разлікі, наперадзе рухалася баявая ахова — усё як і належыць паводле баявых статутаў». Мусіць, з тых жа самых меркаванняў пісьменнік перарабіў і наступную бязлітасную карціну пачатку вайны: «…трымаўся тае формулы ўсюды, якая толькі і давала яму захоўваць выразнасць сваіх адносін у тым хаосе бязладдзя, разгубленасці, прадажнасці і трусасці, з якімі ён неспадзявана для сябе сутыкнуўся з самага пачатку вайны», — у пазнейшай рэдакцыі тут засталася абсалютна нейтральная думка: «…і ўсюды трымаўся менавіта таго перакананння, што толькі і давала яму захоўваць цвёрдасць сваіх пазіцый ва ўсіх складанасцях гэтай вайны».

Гэтыя самацэнзурныя меркаванні не аднойчы яшчэ прымушалі Быкава перапісваць уласны твор. Такім чынам, напрыклад, цалкам знікла гісторыя пра безыменнага мясцовага работніка, які замест таго, каб арганізоўваць у лесе партызанскі рух, вярнуўся да сям'і, за што і быў пакараны сваімі ж, бо, «хоць ён і не пайшоў да немцаў, але пэўна ўжо дэзерціраваў ад вайны». Тым больш што агаворка: «мо гэта было і няправільна», — дазваляла западозрыць аўтара ў «абстрактным гуманізме». Не засталося следу і ад згадкі, што вораг «неспадзявана засеў пад Масквой і дарма што трубіў, нібы вось-вось бальшавіцкая сталіца падзе», і што «Масква — не Карчоўка, абараніць яе ўжо знойдзецца сіла», бо лепш было не прыгадваць ні восень 1941-га, ні тысячы здадзеных фашыстам савецкіх карчовак, абараніць якія сілы не знайшлося. І таму ў пазнейшай рэдакцыі будзе ўжо не «жах разгрому», а «страх акружэння» — менш эмацыйная, ці, як бы сёння сказалі, дыпламатычная фармулёўка.

І, відаць, каб дадаць Сотнікаву мужнасці-цвёрдасці і зняць з яго фатальную «обреченность» (аб чым так настойліва прасіла рэдкалегія «Полымя»), Быкаў крэсліў і крэсліў свой твор. І вось ужо ў пазнейшай рэдакцыі адсутнічаюць цэлыя сказы і фрагменты, гаворка ў якіх ідзе пра Сотнікава: «Твар, рукі, калені занямелі на ветры і сцюжы — было зусім блага і ў той жа час неяк бязвольна абыякава да ўсяго і да сябе ў тым ліку»; «І ў галаве яго прамільгнула кароценькае меркаванне-ўспамін аб тым, колькі разоў ён жахаўся ад гэтае самае свае думкі-канца, які дагэтуль усё неяк мінаў яго, адсоўваўся, не праўдзіўся. Але тут ужо не спраўдзіцца ён не мог»; «…жыццё спарахніла вайна, з самага яе пачатку ўсё пайшло не так — усё наперакос» і г. д.

Аднак там, дзе аўтар усё ж не здолеў перапісаць свой твор, на «дапамогу» прыходзіў жорсткі

рэдактар. Таму і з'яўляюцца новыя скарачэнні, якія зроблены ўжо «палымянскай» рэдактурай: «Яго, параненага і хворага, найперш пакідала тое, што было найболей патрэбна»; «Хай бы ўжо везлі хутчэй ды канчалі, як там надумалі. Мяркуючы па ўсім, іхняе існаванне на гэтым свеце ўжо не мела вялікага сэнсу». І канешне, не мог Сотнікаў «нечакана для сябе, у прыліве збалелае душэўнай шчырасці» ўспомніць Бога, «чаго з ім не здаралася ніколі», таму гэты сказ рэдактурай быў зноў жа выкраслены. Таксама як, вядома, не мог ён у апошні момант прыгадаць Біблію, якая некалі ляжала на маміным камодзе, і «хлапчуком ён часам гартаў яе пажоўклыя з асаблівым, застарэла-кніжным пахам старонкі»…

Зразумела, што рэдактарскія скарачэнні датычыліся не толькі Сотнікава. Да прыкладу, вось Быкаў піша пра партызанаў: «…з восені яны сюды не патыкаліся — кружылі па іншых мясцінах, па той бок шашы, пакуль голад і карнікі не загналі іх зноў туды, адкуль месяц назад выгналі», але падчас рэдагавання ў «Полымі» слова «голад» было выкраслена. Ці вось Рыбак, заўважыўшы ў сцяне старастаvай хаты дзіркі ад куль, пытаецца, хто страляў, і староста адказвае: «А такія, як вы. Гарэлкі трэбавалі», — але і гэтае надта ўжо недвухсэнсавае параўнанне партызанаў з паліцаямі рэдактура «Полымя» не пакіне незаўважаным — замест словаў «як вы» з'явіцца шматкроп'е. А ад рэплікі ж следчага Партнова: «Гэта Саветы нічога не маглі. Хіба што караць», — у «Полымі» застанецца толькі першы сказ.

Прыгадаюць аўтару і такую «палымянскую» прэтэнзію: «Не хацелася б, каб людзі "праходзілі міма" Басі — Вашай гераіні, — калі яна хаваецца ад немцаў і паліцыі…» І таму знікнуць падчас першапублікацыі наступныя сказы з аповеда Басі: «…парсюкі там былі. Дык я каля іх. Заціснулася ноччу між свіннёй і падсвінкам і сплю. Свіння спакойная была, а падсвінак нягодны — кусаўся…»; «А ела… Ну там у карыце нешта выбірала…» І, відаць, каб людзі не «праходзілі міма» Басі, ужо ў пазнейшай рэдакцыі ў характарыстыцы дзяўчынкі перад сцэнай пакарання — «апанураная адзінокая Бася» — рэдактар выкрасліў «адзінокая»…

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што былі заўвагі да аповесці і зусім іншага характару, да якіх Быкаў паставіўся з разуменнем. Пра адзін такі выпадак распавядаў сам Васіль Уладзіміравіч: «Чытач-астраном з Масквы паведаміў, што малады месяц, які тою парой з'яўляецца ў небе вечарам, не можа свяціць і ноччу: да поўначы ён павінен зайсці. Гэта правільна, і я пасля гэта выправіў». У аповесці ж, у 5-м раздзеле, сапраўды чытаем: «Час, мабыць, мінуў за поўнач, маладзічок узлез у самую высь неба і ціха блісkaў там, па-ранейшаму завалочаны святлявым мроівам. Зоркі наўкола яго іскрыліся ярчэй, чым увечары, гучней рыпеў снег пад нагамі — у самую сілу ўбіраўся мароз». Адзначым, што пісьменнік атрымаў некалькі падобных лістоў ад чытачоў, прывядзем адзін з іх:

«4.2.71. п. Научный

Глубокоуважаемый Василь Быков!

В Вашей первоклассной повести "Сотников" есть грубая ошибка: "тоненький серпик месяца" светит партизанам на протяжении почти всей ночи. В действительности тоненький серпик может быть виден на небе лишь 2–3 часа после захода солнца (молодой месяц), и затем он заходит, либо за 2–3 часа перед восходом солнца (старая луна), после чего он теряется в лучах солнца. Около полуночи "в самой выси неба" может быть лишь полная, или близкая к полной, луна. Этот промах, который мне, астроному, бросился в глаза, может быть заметен многим наблюдательным людям самых разных профессий, и его следует исправить при следующем издании повести.

С искренним уважением и наилучшими пожеланиями,

Р. Е. Гершберг 334413 Крым, п. Научный».

Аднак Быкаў, мусіць, памыліўся: ні ў першым кніжным выданні «Сотнікава», ні ў публікацыях у зборах твораў ён не выправіў гэтую астранамічную недакладнасць.

Няўдалая спроба экранізацыі

У другой палове XX стагоддзя па творах Васіля Быкава было пастаўлена дзевятнаццаць мастацкіх фільмаў. Да значнай часткі з іх ён сам напісаў сцэнарыі ці зрабіў гэта ў суаўтарстве з рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі. Аднак сярод такой колькасці фільмаў Быкаў вылучаў толькі «Узыходжанне» Ларысы Шапіцька — экранізацыю «Сотнікава». Сцэнарый для карціны быў напісаны Ларысай Шапіцька ў суаўтарстве з драматургам Юрыем Клепікавым. Між тым, Васіль Уладзіміравіч ніколі не прыгадваў той факт, што і сам напісаў кінасцэнарый па аповесці «Сотнікаў». Ён быў створаны ў адказ на просьбу кінарэжысёра Ігара Дабралюбава, будучага народнага артыста Беларусі і аўтара славутай кінакамедыі «Белыя росы». Ігар Міхайлавіч распавядаў падчас аднаго нашага з ім інтэрв'ю: «Давным-давно я прочел только что опубликованную в журнале повесть Василия Владимировича Быкова "Сотников". Потрясенный, я тут же сел в свою машину и помчался в Гродно к Василию Владимировичу. Приехал, встретились друзья-товарищи.

— Хочу снимать, — говорю.

Я так волновался, что, как сказал Вася, у него на кухне "поставил мировой рекорд" по количеству выпитого кофе. А он спокойно сказал:



Аўтарскі малюнак Васіля Быкава

— Ладно, напишу сценарий. Лично для тебя напишу.

И через некоторое время появляется оглушительный сценарий — "Сотников".

Я с ним туда — меня оттуда, я сюда — меня туда. Водили здесь по всем кабинетам, вплоть до самого верха, в Москве — по Госкино, и кто-то такой ловкий, гадкий, мерзкий лейбл приклеил: мол, это сценарий не о Великой Отечественной войне, а "о гражданской войне в период Отечественной". Вот так.

В общем, выгнали отовсюду, не дали снимать, не вышло у нас с Быковым ничего.


Вскоре звонит мне Вася и сообщает, что ленинградский драматург с московским режиссером будут делать картину по этой повести. Решение Госкино. Вот и все. Оторвали у меня кусок сердца и отдали в другие руки».

Заўважым, што Быкавым былі падрыхтаваны, як мінімум, дзве рэдакцыі кінасцэнарыя, аднак ніводная з іх не была прынятая. Сцэнарый не выратавала нават умяшанне сакратара ЦК КПБ па ідэалогіі Аляксандра Кузьміна. Дабралюбаў пісаў у гэтай сувязі Быкаву: «Вот уже несколько дней, как стало известно, что Госкино закрыло нашего "Сотникова". Письма-заключения они еще не прислали, так что я не знаю и не могу тебе точно сообщить ту формулировку, которую пристегнули к сценарию. Да и в этом ли дело? Какая бы ни была формулировка, а сценария в производстве нет и картины не будет.

Насколько я огорчен, один Бог знает.

Знаю, что к Ермашу ходил Александр Трифонович, но и из этого ничего не вышло. (Філіп Цімафеевіч Ярмаш — старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета міністраў СССР па кінематаграфіі. Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін — сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі. — *С. Ш.*) Видно, где-то в более высоких инстанциях произошли какие-то изменения. По отношению к сценарию».

Між тым назва кінасцэнарыя, «Двое в ночи», мусіць, невыпадковая — такім чынам аўтар, магчыма, спрабаваў «вярнуць» адну з ранніх назваў аповесці. Экзэмпляр сцэнарыя захаваўся ў гродзенскай частцы архіва Васіля Быкава, у яго малодшага сына — таксама Васіля. Сцэнарый значна перапрацаваны пісьменнікам, аднак у першую чаргу звяртаюць на сябе ўвагу папраўкі, на якія Быкаў, хутчэй за ўсё, быў вымушаны пайсці, бо асобныя месцы ў сцэнарыі адзначаны алоўкам (вертыкальнай лініяй побач з тэкстам), і малаверагодна, што гэта зроблена самім аўтарам, — магчыма, рэдактарам з кінастудыі, бо наўрад ці аўтар такім чынам самацэнзураваў уласны твор. Да таго



Распрацоўка сюжэта «Ліквідацыі». Архіў В. Быкава (Гродна)

ж практычна ўсе праўкі і ўстаўкі зроблены Быкавым сінім чарнілам двух адценняў, аловак жа для гэтай мэты ім практычна не выкарыстоўваўся. Акрамя таго, сустракаюцца праўкі відавочна нелагічныя. У першую чаргу гэта датычыцца раптоўнага з'яўлення ў сцэнарыі вялікай колькасці немцаў, якія замяняюць перакрэсленых аўтарам паліцаяў (лік якіх, адпаведна, памяншаецца), што часам прыводзіць да нестыкоўкі асобных планаў сцэнарыя. Так, напрыклад, на двор да Дзёмчыхі, згодна з першай рэдакцыяй, прыходзяць тры паліцаі, аднак Быкавым выпраўлена — «несколько немцев» — і праз тры абзацы: «немцы уже вошли в сени». Паліцаі тут нават не ўзгадваюцца, аднак размову гэтыя «немцы» вядуць на рускай мове, і нават вядома імя аднаго з іх — Стась (праўда, далей у гэтым жа раздзеле аўтар не выправіў «паліцаяў» на «немцаў»). Таксама паспешліва ўпісаны ў эпізод «гер Будила», пазнейшая характарыстыка якога («…здешний палач. Это был буйволоподобный двухметрового роста детина с обезьяньей мордой и длинными руками») выкраслена, відаць, з той прычыны, каб наўпрост не згадваць «тутэйшасць» ката. Новыя персанажы-немцы з'яўляюцца і ў далейшым (напрыклад, падчас допыту Сотнікава Партновым у канцылярыю ўвойдзе шэф СД і паліцыі бяспекі), хоць іх няма ў аповесці і не было ў першай рэдакцыі сцэнарыя.

Гэтае часам нічым не апраўданае ўмяшанне ў драматургічны твор было б цяжка матываваць, калі б не прыведзенае вышэй сведчанне І. Дабралюбава пра тое, што нехта ўбачыў у сцэнарыі аповед пра грамадзянскую вайну ў часы вайны Айчыннай. Трэба думаць, праз гэта аўтар і пачаў так паспешліва «пазбаўляцца» ад паліцаяў. Прыгадаем таксама, што яшчэ падчас падрыхтоўкі аповесці да друку, у прыватнасці, пры яе абмеркаванні на паседжанні рэдкалегіі часопіса «Полымя» Іван Пташнікаў кінуў аўтару «Сотнікава» папрок, быццам у творы «занадта шмат нашых» і «мала немцаў», а Анатоль Вялюгін адзначыў, нібыта ў Быкава — змаганне з трэцяй сілай, як у грамадзянскую вайну. Але тады падобныя прэтэнзіі не мелі сур'ёзных наступстваў, хоць зноў жа нагадаем, што Павел Кавалёў і Іван Пташнікаў, абагульняючы заўвагі па аповесці, звярталіся да аўтара, каб ён абавязкова паказаў фашысцкіх захопнікаў, а не мясцовую паліцыю. І хоць Быкаў побач з гэтым пунктам пазначыў алоўкам «болей немцаў» і сапраўды нешта змяніў у аповесці, аднак масава немцы з'явіліся ўжо толькі ў сцэнарыі.

І што тычыцца яшчэ заўваг кінацэнзараў: не выключана, што менавіта яны прымусілі пісьменніка пазбавіцца і ад аднаго з эпізадычных персанажаў — паліцая па прозвішчы Тарасюк (замест яго паўсюль упісаны паліцай Стась). Справа ў тым, што ў сцэнарыі (таксама як і ў аповесці) быў ужо адзін адмоўны персанаж з украінскім прозвішчам — усё той жа Стась Гаманюк. Пасля публікацыі ў 1966 г. у «Новом мире» аповесці «Мёртвым не баліць» Быкаву працяглы час ставілі ў віну «пространные намеки с попыткой противопоставить украинцев белорусам, утверждение, будто бы все украинцы чуть ли не с раскрытыми объятиями встречали гитлеровцев». І таму, па сведчанні былога прадстаўніка Галоўліта СССР Уладзіміра Соладзіна, "у прозе Васіля Быкава асабліва адсочваліся суадносіны "станоўчых" і "адмоўных" герояў па нацыянальных прыкметах: колькі і якіх рускіх, беларусаў, украінцаў". І калі ў аповесці «Сотнікаў» галоўлітаўскія цэнзары ці не дагледзелі, ці проста пакінулі без увагі ўкраінскія прозвішчы адмоўных персанажаў, дык у кінасцэнарыі цэнзура, відаць, выявіла большую пільнасць: Тарасюк аўтарам быў выкраслены.

Тым не менш нават і гэтыя праўкі не выратавалі сцэнарый — экранізаваць «Сотнікава» Ігару Дабралюбаву не далі. Калі быкаўская аповесць, хоць і дзіўным чынам, але ўсё ж дайшла да чытача, дык кінематаграфічная цэнзура аказалася больш пільнай і жорсткай, і практычна нікому невядомы сцэнарый «Двое в ночи» застаўся фактам толькі літаратурным, але — адзіны выпадак у біяграфіі Васіля Быкава — не кінематаграфічным.

Што ж тычыцца аповесці, дык першапачатковую, безцэнзурную, яе рэдакцыю адшукалі на пачатку XXI стагоддзя і выдалі толькі цяпер, у 2014 г., да 90-гадовага юбілею Васіля Быкава. Аднак, як і ў выпадку з «Мёртвым не баліць», дасюль застаецца адкрытым пытанне: якому варыянту твора аддадуць перавагу выдаўцы і чытачы — аўтарскаму ці таму, які быў зроблены пад пільным наглядам савецкай цэнзуры?

Усе мы нібыта падрыхтаваныя да непазбежнага развітання з блізкімі і сябрамі — два жыцці не пражывеш. Але жыццё, даўжэйшае за зямное, даецца асобам, што здолелі стаць блізкімі шырокаму колу самых розных людзей, — праз справы, творы і ідэі, якім наканавана жыць ці не праз пакаленні.

Страты года



Аляксандр ***ТАМКОВІЧ***

2014 год не быў высакосным, якія звычайна звязваюць з вялікай колькасцю нябожчыкаў, але ён прынёс нам столькі горкіх страт! Я выбраў толькі некалькі фота не проста герояў сваіх артыкулаў і кніг, але Асоб, якія павінны быць і будуць адзначаныя ў гісторыі Беларусі.

Напрыканцы студзеня мы, сябры і паплечнікі, сказалі апошняе «прабач» **Генадзю Уладзіміравічу Грушавому**, чалавеку, які заўсёды ўражваў сваёй энергічнасцю і якога, на мой погляд, не адно пакаленне беларускай грамады яшчэ будзе «адкрываць» і ацэньваць. Хаця б таму, што рэальная справа, якую ён нястомна рабіў, гэтыя пакаленні ратавала ад чарнобыльскай бяды, вучыла жыць у небяспечным нашым свеце з апорай на розум і дабрыню, разбіваючы не толькі межы «местачковых» уяўленняў ды ідэалагічных забабонаў, але дзяржаўныя межы — амаль літаральна. За 20 гадоў працы створанага Грушавым фонду «Дзецям Чарнобыля» было наладжана супрацоўніцтва з 21 краінай свету, дзе актыўна дзейнічалі, скіраваныя на дапамогу беларусам, больш за 500 розных ініцыятыў, а на аздараўленне за мяжу выехала больш за 300 000 беларускіх дзяцей, лічы, насельніцтва даволі буйнога горада.



Мы былі добра знаёмыя, пра дакладнасць у справах і арганізаванасць Грушавога ведаю, канешне, не толькі я, але апошнім сваім зямным учынкам Грушавы ўразіў мяне бязмежна. Прыблізна за месяц да сваёй смерці ён патэлефанаваў у Дом смутку «Цырыманіял» і літаральна «рэгламентаваў» асабістае пахаванне. Якія кветкі варта прыносіць (белыя ружы), якія любімыя карціны павінны стаяць побач з закрытай трунай, якая музыка будзе гучаць у зале, хто са святароў адпявае нябожчыка і г. д. Гэта з яго волі ўсіх, хто прыйшоў развітацца, сустракаў ягоны ўсмешлівы партрэт. Велічэзнай колькасці ягоных сяброў, вучняў, паплечнікаў, удзячных удзельнікаў шматлікіх распрацаваных Фондам праграм Грушавы літаральна забараніў бачыць, што ягонае цела скончыла зямны шлях, — ён падбадзёрваў і заклікаў усіх жыць і працаваць далей, дэманструючы: я з вамі!

Так можа зрабіць толькі МУЖНЫ чалавек.

У садзе, што быў закладзены 26 красавіка 1991 года побач з месцам, дзе потым пабудавалі храм створанай тады парафіі ў гонар Божай Маці, Усіх Тужлівых Радасць, Грушавы пасадзіў грушу. Дрэва зараз — у каляровых стужках. Сябры і паплечнікі дадаюць і аднаўляюць папсаваныя дажджом і снегам; жонка Ірына, дзеці, паплечнікі не так даўно ўсталявалі ў садзе кованую лаўку, — каб кожны мог прысесці, падумаць, параіцца ці паспрабаваць дазнацца, што ж за чалавек вітае яго ўсмешкай з партрэта ля «каляровага» дрэва...

А здымак з ляснога адпачынку, што зроблены вядомым фотамайстрам і сябрам Генадзя Яўгенам Коктышам, ёсць і ў маім альбоме.

Дарэчы, менавіта на пахаванні Генадзя Грушавога я пачуў пра горкую хваробу яго цёзкі — **Генадзя Мікалаевіча Бураўкіна**, які праз чатыры месяцы (30 траўня) таксама адыдзе ў вечнасць... Пра анкалогію тады яшчэ ніхто не казаў (і, напэўна, не ведаў), таму надта хацелася верыць у лепшае. Але…

Добрыя ўзаемадачыненні з Генадзем Мікалаевічам Бураўкіным у мяне склаліся вельмі даўно. Нельга сказаць, што зносіны нашы былі самымі цеснымі і сяброўскімі, але пэўная адлегласць па ўзросце ніколі не перашкаджала творчаму супрацоўніцтву і павазе. Для адной з маіх кніжак Бураўкін напісаў прадмову, на прэзентацыі другой выступаў, хоць не быў сярод герояў гэтага зборніка.

Канешне, было прыемна чуць яго станоўчую ацэнку майго артыкула на «Хартыі» ў падтрымку беларускай мовы — калі табе тэлефануе адзін з лепшых паэтаў сучаснасці, кожны журналіст адчувае сябе «вышэйшым ростам».

Шмат гадоў таму для кнігі «Лёсы» я папрасіў Генадзя Мікалаевіча распавесці сваю біяграфію. Пісьмова, натуральна, бо пісаць за майстроў з прыстаўкай «супер», мякка кажучы, неэтычна. Прайшоў пэўны час, і я амаль вырашыў «педаляваць» просьбу, аднак гэтага не спатрэбілася. За некалькі гадзін да новага 2009 года Бураўкін патэлефанаваў сам і прапанаваў абавязкова сустрэцца «пасярэдзіне». Нашы дамы месяцца адносна недалёка адзін ад аднаго, таму сустрэчу ён прызначыў «агульназадавальняльную».



Так у маіх руках апынуліся рукапісны тэкст і шэраг фота. У тым ліку і з Уладзімірам Сямёнавічам Караткевічам, якое і друкуецца сёння.

Паводле традыцыі Генадзь Мікалаевіч не захацеў «цягнуць» у новы год нявыкананае абяцанне, таму да шматлікіх эпітэтаў, якія не раз гучалі ў яго адрас, я б дадаў яшчэ адзін — АБАВЯЗКОВЫ…

У першыя дні сакавіка 2014 года не стала **Рыгора Іванавіча Барадуліна**, апошняга Народнага (званне з 1992 года) паэта Беларусі.



Нягледзячы на даволі добрае асабістае знаёмства, камунікацыі паміж намі ажыццяўляліся праз агульнага сябра, вядомага журналіста Сяргея Шапрана, за што яму — чарговы дзякуй. Менавіта Сяргей дапамог падрыхтаваць біяграфічны тэкст Рыгора Іванавіча, і менавіта ён (як заўсёды) прынёс мне чарговую кнігу Барадуліна.

Цікава, што для такога падарунка не было ніякай нагоды. Так захацеў «дзядзька Рыгор», і Сяргей крыху нават здзівіўся такой (прыемнай для мяне) просьбе.

Перадаць мне кнігу Барадулін папрасіў незадоўга да смерці... Зрабіць падобнае можа толькі вельмі СВЕТЛЫ чалавек. Той, які прызвычаіўся рабіць іншым добрае.

Для гэтага артыкула-ўспаміну здымак з жонкай Васіля Быкава Ірынай Міхайлаўнай я выбраў невыпадкова. Як вядома, Быкаў і Барадулін былі лепшымі сябрамі на гэтым свеце. Няхай імі застануцца і там…

Ёсць нешта непадуладнае асэнсаванню і ў такім факце. Першым паэтычным зборнікам Барадуліна ў 1959 годзе быў «Маладзік над стэпам». 2 сакавіка 2014 года выйшаў апошні твор Паэта — «Зорка над Беларуссю». Зорка па імені Рыгор Іванавіч Барадулін, якая не шкадавала цяпла і святла для дзясяткаў творчых «маладзікоў» і нават для тых, хто цвердзіць, што расчараваўся ў справядлівасці нябёсаў...

13 студзеня 2015 года споўнілася б 75 гадоў **Міхаілу Афанасьевічу Марынічу**, і я рыхтаваў да гэтай падзеі кнігу нашых размоваў. Хаця слова «размова» ў дадзеным выпадку гучыць вельмі ўмоўна. Пасля другога інсульту Марыніч размаўляў даволі праблемна. Увесь жнівень я ездзіў да Міхаіла Афанасьевіча на лецішча, паказваў фота з чарговага альбома, якое прыязна рыхтавала яго жонка Таццяна, і той (некалькімі словамі) тлумачыў «што, дзе, калі».


На шчасце, здымкаў было вельмі шмат — фатаграфаванне было хобі Міхаіла Афанасьевіча. Перад камандзіроўкай у Афганістан (1968 год) ён набыў фотаапарат ФЭД, а потым і відэакамеру, і ніколі з імі (нават у афіцыйных візітах) не расставаўся.

Вось на фота аднаго з ягоных сяброў зафіксавана: каб лепш сфатаграфаваць афганскага караля, які прыехаў да іх, Марыніч забраўся на дах службовага аўтобуса.

Дарэчы, пазней адзін са здымкаў Марыніча перамог у конкурсе, які ладзіла тады савецкая амбасада ў Кабуле.

Узгаданае з дапамогай здымкаў ужо склалася ў тэкст, які я, па дамоўленасці, павінен быў паказаць Міхаілу Афанасьевічу. Не паспеў. 17 кастрычніка 2014 года журналіст радыё «Свабода» Валерый Каліноўскі паведаміў сумную навіну…

Днямі я даведаўся, што незадоўга да смерці Марыніч «распрацоўваў» руку, каб можна было на кнізе пісаць аўтографы…



І яшчэ. Дзякуючы жнівеньскім сустрэчам, зараз я шмат ведаю пра жыццё Міхаіла Афанасьевіча і не магу суняць асабістае здзіўленне яго неверагоднай ПРАЦАЗДОЛЬНАСЦЮ.

Горкае кола круцілася гэтым годам! На трызне па Марынічу я апошні раз бачыў **Валерыя Дзмітрыевіча Фралова**. Як вядома, ён збіраўся балатавацца ў прэзідэнты, прасіў дапамагчы з разумным і прыгожым тэкстам улёткі. 10 лістапада высветлілася, што замест улёткі трэба рабіць некралог…

Ведаю, што журналісты любілі прэс-канферэнцыі, у якіх удзельнічаў Фралоў, бо той не часта прытрымліваўся ўласцівага палітыкам лексікону. Заўсёды гаварыў тое, што думаў, і час ад часу называў сябе «маладым палітыкам», таму што прыйшоў у палітыку ў даволі сталым узросце.

Танкіст… Генерал… Нетыповы генерал, які апраменьваў шчырасцю. Цалкам згодны з тымі, хто называе Валерыя Дзмітрыевіча



ПРЫСТОЙНЫМ чалавекам. Ён быў менавіта такім.

На ягоным школьным фота я наўмысна не пазначаю Фралова. Усё там зразумела і без подпісу.

Год Каня забраў у вечнасць адразу пяць герояў маіх кніг, аднак гэтым, на жаль, не абмежаваўся. Шкада, што побач з намі больш няма калегі, ПРАМЯНІСТАГА **Пятра Марцава**, НАДЗЕЙНАГА **Анатоля Удавічэнкі** і мноства тых, каго зараз згадвае кожны чытач…





У гадавіну забойства Веранікі музыкі спявалі пра жыццё і волю

Вечарына памяці Веранікі Чаркасавай праходзіла ў не зусім звыклым фармаце: пра журналістку гаварылі не столькі сябры, калегі і сваякі, колькі музыкі — Лявон Вольскі, Аляксандр Кулінковіч, Аляксандр Памідораў, Алесь Дзянісаў. Многія з іх былі ў свой час героямі яе матэрыялаў, бо Вераніка шмат пісала і пра музыку.

У сталічнай галерэі «Ў» прысутным прэзентавалі зняты ў гэтым годзе дакументальны фільм «Таямніца следства. P. S.» , які даследуе адну з версій забойства Чаркасавай — гэтак званы «іракскі след». Аўтар стужкі — беларускі кінадакументаліст Леанід Міндлін.

Падчас імпрэзы гучалі ўрыўкі з артыкулаў Веранікі, сабраных у кнізе «Чырвоным па белым». Зборнік лепшых артыкулаў Чаркасавай упершыню пабачыў свет у 2005 годзе, а напярэдадні 10-й гадавіны забойства журналісткі быў перавыдадзены.

Фота: www.baj.by





Дыяна Чаркасава, маці Веранікі



Nimium ne crede colori

Не надта давярай колеру (не ўсё тое золата, што блішчыць) (*лац.*).

Мы хацелі зрабіць рубрыку «Ляпы года». Але хто прызнаецца, што зрабіў тут больш за іншых? Заўважаць свае памылкі прыкра, чужыя — чамусьці смешна.

І тады вырашылі, што лепш паразважаць, як не «абляпацца». Дзякуй калегам, што падзяліліся досведам.



Настасся МАЦЯШ

Давярай, але правярай. А лепш — правярай і пераправярай. Нават калі карыстаешся крыніцай, у надзейнасці якой не сумняваешся. Пагатоў цяжка не даць веры гучным імёнам інфармацыйных агенцтваў.

І тым не менш звесткі трэба спраўджваць. Паўсюль працуюць людзі, і яны часам памыляюцца. І калі, расказваючы пра падзею, можам спаслацца на крыніцу і часткова зняць з сябе адказнасць за памылку («Паводле выдання *The New York Daily News*…», «Як цвердзіць *Le Monde*…», «Са словаў журналіста *Deutsche Welle*…»), то няправільна напісанае / прачытанае ў эфіры імя застанецца на сумленні аўтара матэрыялу. (Не скажаш жа: «Як называе гэтага чалавека *Le Figaro*…») Гэтак узнікаюць няісныя персанажы, памылка пашыраецца, праз «перапост» пераносіцца з сайта на сайт, і за колькі дзён у інтэрнэце колькасць няправільных напісанняў прозвішча палітыка, мастака ці ўдзельніка падзеяў можа перасягнуць лік правільных.

Reuters піша пра мультыплікацыйны фільм мастака *Miyao Hayazaki*. Журналіст рыхтуе навіну: Міяо Хаядзакі атрымаў ганаровую прэмію «Оскар» за заслугі ў кінематографе. І гэтак праз памылковую перастаноўку пачатковых складоў самы вядомы ў Японіі (ды і на свеце) мультыплікатар Хаяо Міядзакі (*Hayao Miyazaki*) вымушана аддае свае лаўры творцу, якога няма.

А вось дасканалае ВВС падае інфармацыю: «Дэвид Цвернер, галерист (Германия)». Але ж кіраўнік галерэі Дэйвід Зврнэр (*David Zwirner*), пра якога ідзе гаворка, — амерыканец, ягоныя мастацкія галерэі месцяцца ў Нью-Ёрку і Лондане, а не ў Нямеччыне. Кошт памылкі — процьма згадак у інтэрнэце пра «*Дэвида Цвернера*» і «*Цвирнера*», і НІВОДНАГА кірылічнага напісання, блізкага да правільнага, хоць менавіта Зврнэрам галерыст сам сябе называе ў роліках на *YouTube*. Імя чалавека — галоўны ідэнтыфікатар асобы. З ім варта быць асабліва ўважлівым і не шкадаваць хвіліны на праверку інфармацыі.

Пагатоў спраўдзіць імя ці нейкую назву варта, калі маеш справу з менш значнымі крыніцамі. Журналіст, спасылаючыся на свежыя польскія выданні, падае пасаду палітыка Робэрта Вінніцкага (*Robert Winnicki*) як прэзідэнта арганізацыі *Młodzież Wszechpolska*. Але ж няцяжка ўпэўніцца, што ён ганаровы, а не дзейны прэзідэнт «Агульнапольскай моладзі», ягоная ж асноўная палітычная праца звязаная з аб'яднаннем «Нацыянальны рух» (*Ruch Narodowy*). Гэткія памылкі псуюць агульнае ўражанне ад матэрыялу і спрыяюць пашырэнню недакладнай інфармацыі.

Вось яшчэ яскравы прыклад выкарыстання неправеранай навіны: «...стваральнікі лятучага скейтборда *Arx Pax* і *Los Gatos* запэўніваюць, што змогуць падоўжыць час працы прылады. Маладыя людзі ўжо назбіралі неабходную суму грошай на платформе *Kickstarter*...» Высвятляем праз пошук дадатковую інфармацыю пра гэтых «маладых людзей» і даведваемся, што *Arx Pax* — назва кампаніі, *Los Gatos* — горад у Каліфорніі.

Гэтак жа недапушчальна падаваць імёны па памяці. Такім чынам у матэрыялах журналістаў паўстае палітык Густаў Эцінгер (замест Гюнтэра Этынгера, *Günther Hermann Oettinger*, камісара Еўразвязу па энергетыцы) або карэспандэнт газеты «Прессбол» Сяргей Юкжык (вядома ж, насамрэч Сяргей Южык). І калі першы пра памылку ў сваім імені, зробленую ў беларускіх медыях, хутчэй за ўсё, ніколі не даведаецца, то другі наступным разам можа і адмовіць у каментары ды супрацы.

Варта больш крытычна ставіцца і да працы калегаў, калі выкарыстоўваеш іхныя матэрыялы. Адзін эксперт у праграме другога эксперта сцвярджае, што слова «пенсія» паходзіць ад англійскага «пенс» (*pence*). І гэтае этымалагічнае вынаходства не толькі не выразаецца падчас мантажу тэлепраграмы, але і спрабуе прабіцца на сайт сродку масавай інфармацыі. За паўхвіліны можна высветліць, што слова «пенсія» паходзіць ад лацінскага *pensio* (плацеж), і пазбегчы ганьбы.

Часам жа зусім ужо неапраўданым даверам карыстаюцца прэс-рэлізы разнастайных арганізацыяў, і за праўдзівую інфармацыю выдаецца звычайная памылка набору.

Вось фрагмент маіх перамоваў з журналістам — аўтарам матэрыялу:

Н. М.: «…хворага на ДТП». Што такое ДТП?

ХХ: Цяжка сказаць, хвароба, па-ўкраінску таксама ДТП.

Н. М.: Я не бачу ў інтэрнэце ніводнай спасылкі, каб згадвалася хвароба ДТП, — ні па-расейску, ні па-ўкраінску.

ХХ: Гэта — прэс-рэліз, там не можа быць памылкі.

І тым не менш беспамылковы прэс-рэліз памыліўся, назваўшы дзіцячы цэрэбральны параліч хваробаю ДТП, што нескладана было высветліць з дапамогаю інтэрнэт-пошуку або звязаўшыся з героямі сюжэта.

У матэрыяле не мусіць заставацца нявысветленых назваў мясцінаў, невядомых абрэвіятураў, не правераных імёнаў людзей. Дакладнае, праверанае падаванне моўных фактаў (імёнаў, прозвішчаў, назваў) не менш важнае за слушную агульную інфармацыю пра падзею. Акуратнасць тут станоўча працуе і на імя аўтара, і на давер да сродку масавай інфармацыі.

Прэм'ер-міністр — у Карыны

І, працягваючы тэму, пры канцы прапаноўваю нізку смешных памылак набору і няправільных словаўжыванняў са штодзённай практыкі стыль-рэдактаркі:

Сістэма п**арв**асуддзя — *Аўтар верыць, што суддзі гатовыя парваць кожнага, хто не пагодзіцца з іхным рашэннем.*

Амаль фрэйдаўская апіска ў матэрыяле пра Лукашэнку: кол**я** ягоных сяброў.

Вазочнікі не могуць свабодна перасоўвацца з-за адсутнасці па**тн**усаў... — *Ад слова «патнець». Мабыць, маюцца на ўвазе нейкія падпахавыя пракладкі.*

Гладка **аголеныя** твары — *Бессаромна!*

З **Арзейбаджана** — *Насамрэч гэта скорагаворка, не сумнявайцеся!*

Аднак пра хаду новага пратэсту ў Грэцыі яе **х**ыхары з айчынных медыяў не даведаюцца. — *Хыхар — падвід хахулі.*

І ўсё ж журналістыка не давала **пакою**. — *Пакой даводзілася здымаць за свае грошы.*

...Ён папросту **абарзіў** мяне... — *Бо калі цябе хтосьці абражае, то ты становішся борзы.*

Паводле выканаўчага дырэктара **сацыяцыі** «Аднаўляльная энергетыка»... — *Агарод — гарод, агурок — гурок, асацыяцыя — сацыяцыя... Уласнабеларускія моўныя працэсы пашыраюцца на запазычаныя лексемы.*

Пакуль улады вырашалі, калі ж распачаць выбары самых **с**высокапастаўленых прадстаўнікоў народа… — *Надта праўдзівая апіска!*

Буйная с**ф**інаферма — *Ферма для сфінак, а мо нават сфінксаў.*

Усе яны ўцягнутыя ў скандал з махлярствам вакол новазбудаваных **вільготных** кватэраў. — *Мокра ў тых ільготных кватэрах, мокра.*

Больш за сотню **пацяпрелых** — *Упрэлі на акцыі і сталі прэлыя.*

Подпіс: ПРЭМ'ЕР-МІНІСТР **УКАРІНЫ** — *А чаму б прэм'еру да Карыны не схадзіць?..*

У афіцыйным лісце да прэзідэнта Барака Оўбамы Дэйвід Пэтрэюс прызнаўся, што пасля трыццаці сямі гадоў сямейнага жыцця яму не хапіла развагі і ён завёў **раманс** з іншай жанчынаю. — *Не бачу ў рамансе з жанчынаю нічога кепскага, шуміха на пустым месцы. Мог бы і больш жорсткі жанр абраць…*

Загаловак: Герасіменя ніяк не наплаваецца. — *Домрачава ніяк не настраляецца, Мірны ніяк не нагуляецца ў тэніс…*

…Нарадзілася беларуская акцёрка Марыя Зінкевіч. На тэатральнай сцэне яна грала ў купалаўскай «Паўлінцы» і **«Варотах бяссмерця»** Кандрата Крапівы. — *«Вароты бяссмерця» — гэта класіка. У школе праходзяць, адзнакі ставяць, за чвэрць выводзяць, пасля за год, пасля атэстат выдаюць, пасля на працы чалавек робіць — вось тут школьныя веды і надаюцца!*

Касціцын-малодшы раптам выключыўся з барацьбы ды **паехаў на ізмену**, у выніку чаго «Ойлерз» зрэалізавалі свой выпад «два ў аднаго». — *І няхай Касціцын ведае, як ягоныя дзеянні глядзяцца збоку, будзе думаць, куды ездзіць.*

Падчас інаўгурацыйных **прадпрыемстваў**, што прайшлі 19 сакавіка ў Ватыкане, адбылася кароткая пратакольная размова старшыні надзвычайнай дэлегацыі Беларусі з новаабраным пантыфікам. — *Беларуская зямля славіцца калійнымі прадпрыемствамі, а ватыканская — інаЎгурацыйнымі.*

За лідарам **чарадою сцелецца ланцужок** з пяці дружынаў. — *Паэтычная спартовая карціна, вартая адмысловага верша.*

Прапусціўшы ў першым перыядзе ад нагі Рамана Ёзі, які бесперашкодна прапырхаў праз усю пляцоўку, нашыя адгуляліся на пачатку трэцяй дваццаціхвілінкі праз гол Яўгена



Кавыршына. — *Ізноў паэзія: «загінуў ад рукі», «прапусціў ад нагі»… Але найдаўжэй уяўленне трымае, вядома, пырханне хакеістаў.*

Віктар Ражанец, **намеснік раённага савета дэпутатаў**. — *Адказная праца ў намесніка цэлага савета дэпутатаў. Магчыма, існуюць таксама наместнікі ЖЭСаў, а то і намеснікі Акадэміі навук.*

Сёння ж у далёкім 16-м стагоддзі нарадзіўся іх стваральнік… — *І далёкае 16-е стагоддзе бачу як сёння…*

Праз увагу медыяў больш заўважнымі становяцца хранічныя балячкі гэтай дзяржавы: няздольнасць скарумпаваных праваахоўнікаў **забяспечыць законнасць і тэрарызм** у Каўказскім рэгіёне. — *Ну не могуць праваахоўнікі забяспечыць належна тэрарызм у Каўказскім рэгіёне! Бяда.*

Закідалі рэлігійныя ўстановы кактэ**лямі** Молата**вага**. Медыі акрэслілі гэтыя дзеянні як «помс**тва** за тэракт». — *Кактэлі Молата**вага** (не блытаць з кактэ**йлямі** Молата**ва**) напаўняюцца нечым молатым: молатым молатам, напрыклад. Бярэш молаты і робіш помст**ву**.*

Адкладзем жарты **на бок** — *А пасля перавернем на спінку.*

Амерыканская мара пад Берасцем. Белы плот, **пенадычна** падстрыжаны газон. — *Аўтар можа пісаць кнігу «101 спосаб падстрыгчы газон».*

Зазнаўшы паразу на паўночным фронце, паўстан**цыі** наступаюць на Дамаск з усходу. — *Цэлымі станцыямі наступаць не выпадае, небяспечна, таму наступ вядуць паўстанцыямі.*

У шведскім Эстэрсундзе пачынае бег беларуская **тройня** — Настасся Дубарэзава, Дар'я Домрачава, Надзея Скардзіна. — *Сястрычкі-блізняткі, дочкі маці-Беларусі.*

Як сцвярджаюць сіно**пыткі**, тэмпературны фон паміж рознымі канцамі краіны досыць значны: амаль дзевяць гра**суд**аў. — *Лёгкім рухам рукі з прагнозу надвор'я атрымліваецца хроніка ўціску, з судамі ды катаваннямі.*

…Напярэдадні яны **выгулялі ўнічыю** турнір «Ініцыял-2013». — *Калі нічыя, то хто паспрачаецца, што гэта крыху не перамога?*

Лекары створаць сятчатку са ствалавых **кратак**. — *З кратак увогуле шмат чаго можна зрабіць, абы ўмелыя рукі.*

Камераў паболее, а карцінка з кожнай з іх будзе адпраўляцца ў адзіны відэа**цэнт**. — *Ну, ці відэадолар, у каго які гаманец.*

Кіраўнік **мініабароны** Егіпта — *Міні-абарона ад максі-нападу.*

Цяпер малому неабходная **спецыялістычная** дапамога. — *Нармальнае словаўтварэнне: сацыялістычная, фармацэўтычная, спецыялістычная.*

Да доўгачаканага **кранавала** ў Бразіліі засталіся лічаныя дні! — *Кранавал — калі валяць краны. Кожны ведае, што ў Бразіліі гэта заўсёды падзея.*

…Прысудзілі сплочваць **выдаткі на** судовыя **расходы**. — *Выдаткі на расходы — гэта тое самае, што прыбыткі на даходы, толькі наадварот. Вывучайце эканоміку!*

Паліт**тых**нолаг Сяргей Гайдай: Януковіч агучыў планы Пуціна. — *Тых нолаг або гэтых нолаг — заўсёды важна вызначыцца, чыіх будзеце.*

Афіцыйны ж Кіеў настроены рашуча і абяцае **навезці** парадак у мяцежных рэгіёнах. — *Калі парадку няма, яго можна і навезці — ці з суседняга рэгіёна, ці з суседняй нават краіны. Заладоўваеш у цяжкавікі і вязеш.*

Рост смяротнасці ад алкаголю будзе **расці**, упэўнены спецыялісты, паказваючы на **рост** насельніцтва ў свеце, **рост** спажывання алкаголю. — *Калі рост расце, гэта заўсёды свята. А калі рост расце і паказвае на рост, то гэта свята з нечалавечым размахам.*

МУС: З 1 лютага лік опіумных нар**мак**аманаў скараціўся з 80 да 5 %. — *Нар**мак**аман — гэта наркаман, адказны за добры ўраджай маку.*

Галаву Белага дома суправаджае яго правая **рука**, дзяржсакратар ЗША Джон Кэры. — *Галаварукі Белы дом. А хто там у іх за іншыя часткі цела цяпер?..*

І ў працяг антрапамарфічных страшылак: **Вочы Захаду** прыглядаюцца да дзеянняў Расеі ў дачыненні Украіны.

Добрага каляднага настрою — і будзьце ўважлівыя!

За полчаса до войны



Если бы этому ляпу позволили размножиться, Беларусь бы числилась в беспрекословных «врагах» Украины.

Татьяна МЕЛЬНИЧУК

Ситуация совсем недавняя: все приключилось во время ноябрьского визита в Минск главы внешнеполитического ведомства России Сергея Лаврова.

Президент Лукашенко и министр иностранных дел России много говорили об Украине. Пресса, во всяком случае, акцентировала внимание на обсуждении именно этой, животрепещущей в мировой политике, темы.

Журналисту, «следящему» за высокими разговорами по оперативным сообщениям надежных агентств, которые к «телам» допускать не боятся, только и делов — лови цитаты! Вот я и выловила, очень меня насторожившее: «Поэтому я хотел бы, чтобы мы и вы, вместе с Владимиром Владимировичем (президентом РФ Путиным. — *Авт.*), с коллегами из Минобороны обсудили ситуацию и пришли к какому-то единому мнению, может быть, даже к единой позиции, чтобы мы могли вместе четко действовать в одном ключе».

Цитата до сих пор доступна в архивах известного информагентства, сотрудников которого я неподдельно и искренне уважаю за стойкость, выносливость и прочие качества, необходимые при освещении официальных событий, куда по бдительности разномастных охран или просто из лени (это сколько же времени надо потерять, пока пары слов дождешься!) не попадает большинство анализирующих высокие речи репортеров.

И вот этот анализирующий — в данном случае я, грешная, — вдруг вскакивает, роняя приснувшую кошку с колен, не попадая в спешке в домашние тапки.

Если за стол переговоров вместе с президентами России и Беларуси сядятся представители Министерств обороны — для чего им общая «позиция» и общий план? Ясен пень — не для вывода союзными силами с украинского Донбасса заплутавших туда «по ошибке» российских военных-«отпускников»!

Угроза быть втянутыми в близкую войну не только репортера из домашних тапок вытряхнет...

Я немедленно поделилась тревогой с коллегой — известным белорусским аналитиком. Тот, правда, спросил, где такое прочла. Коллега следил за встречей высоких лиц по отчетам БЕЛТА, а там возбудившая меня цитата была подана в «усеченном» виде: мол, Александр Григорьевич высказал пожелание обсудить ситуацию с руководством России — и дальше, про «действовать в одном ключе», коротким фрагментом прямой речи.


Я «сходила» на БЕЛТА, обнаружила, что ряд других информационных лент и президентский сайт (с опозданием на несколько часов) перепечатали БЕЛТАвскую информацию, но тревога от этого только укрепилась подозрением. Вдруг Александр Григорьевич проговорился, а теперь ответственные за правильное понимание его речей пытаются важную оговорку «завуалировать»? Вдруг уже карты-планы раскладывают на штабных столах, и все эти присевшие у нас «НАТО попугать» российские военные самолеты уже принимают белорусскую десантуру, инструктируя, что в «отпуске» им вовсе не кирпичи о голову придется разбивать?

С еще одним коллегой-аналитиком мы сначала обсудили вытекающий из такой опасной перспективы сценарий, а потом прикинули, какие для этого имеются фактические основания. Оснований набралось — даже не на раз-два-три...

Коллега искренне похвалил меня за внимательное чтение цитат и, судя по всему, озадачился собственной разработкой темы.

Мой текст, между тем, писался, и только строгость стиля «моего» работодателя вынуждала наступать на горло возмущенной «песне».

Но «моя» компания, кроме прочего, требует подтверждения скандальных вестей из нескольких источников. И опытный редактор, искренне разделив мои тревоги и тоже горящий нетерпе-





нием поведать о коварных замыслах «союзников» всему миру, приказал мне, тем не менее: «Ищи». Аудио, видео, еще не менее авторитетное информагентство, корреспондент которого слышал все «вживую».

Я щелкала телевизионным пультом — но в программах новостей нужной мне цитаты все не было.

Я «перерыла» новостные сайты — но или «усеченный» БЕЛТАвский вариант, или ссылка на агентство, мне тревогу подарившее.

Я пожалела даже, что не проявила настойчивости, чтобы войти в «пул» — команду репортеров, жертвующих временем и здоровьем ради нескольких реплик вершителей человеческих судеб.

Цитата в полном объеме была обнаружена мною под вечер: БЕЛТА разместило видео именно с этим фрагментом — и все практически шло там по обнаруженному мной еще утром тексту, кроме одного. Не министерства ОБОРОНЫ, а министерства внутренних дел государств-союзников предложил усадить за общий переговорный стол Александр Лукашенко.

«За полчаса до войны» МВД с его миграционными службами и «бдительностью» курсирующих мимо моих окон милицейских «троек» вернуло в мой дом относительное спокойствие.

То есть российские самолеты остались на белорусских аэродромах. И военное союзничество все-таки растет и крепнет. И какой-то «единый подход» Минска и Москвы к конфликту в Украине вполне вероятен, а некоторые говорят — неизбежен. Но — не сейчас.

«Значит, авторитетное агентство N ошиблось?» — только и написал мне старший редактор.

Еще минут через сорок BBC опубликовала текст с заголовком «Сможет ли Лукашенко сохранить нейтралитет по Украине?». Вполне нормальный текст, с отголосками всех терзавших меня тревог. Но без сенсации-«взрыва».

P. S. Коллеги-аналитики, с которыми я контактировала в этот напряженный день, тоже «отписались», не клюнув на внезапную сенсацию. Я позвонила одному из них — сообщить, что обнаружила разночтения в коварной цитате. Коллега, оказывается, тоже все тщательно проверял...

Любопытно, что, выключая компьютер в конце дня, неожиданно для себя «зацепилась» за навязчивый гороскоп на почтовом сервере. «Новости в этот день могут быть ненадежными», — предупреждал меня анонимный астролог.

Хм... Пожалуй, буду поглядывать иногда. Хотя проверять все придется — и не раз.

Мое признание в любви



Елена ЯКЖИК

...Лукашенко? Да он меня насильно привозил смотреть Дрозды! Путин? Приглашал на ужин в гостиницу «Орбита». Обама? Да мы с его женой чаи совместно пили!..

Не знаю, представляют ли люди вне нашей профессии, что такое работа в онлайн-СМИ. Кто стоит за этим бесконечным потоком информации — дайджестом, оперативными новостями, оригинальными авторскими текстами? В каком режиме работают веб-журналисты?

Это, конечно, риторические вопросы. Потребителю и не нужно знать нашей «кухни», главное — получать оперативный и качественный контент. Желательно без «косяков», как мы в редакции называем технические ляпы. Благо их, как и орфографические ошибки, которые обзываем «блохами», можно поправить в считанные минуты. И без настоящих ляпов — фактических ошибок, которые могут повлечь за собой более серьезные неприятности как для отдельного журналиста, так и для ресурса в целом.

Как лично мне удалось избежать ляпов?.. Вопрос, который, пожалуй, сначала поставил в тупик. «Каких таких ляпов?» — подумала я, пытаясь вспомнить сочный пример.

И не смогла.

Поясню. Дело в том, что работа шеф-редактора или выпускающего редактора онлайн-СМИ — это работа практически без выходных, причем в режиме нон-стоп. Это зависимость от новостей, поскольку, выпади из информационного поля на денек-другой — и ты уже не в теме, с пробелом, который обязательно нужно заполнить. Именно поэтому «выпускающие» и в выходные дни — нет-нет, да заглянут в сеть, чтобы увидеть, чем сегодня живут родина и окружающий мир. Именно поэтому, когда кто-то из них выходит из отпуска, ему дается день, чтобы наверстать упущенное и войти в колею. И, к сожалению, именно поэтому в голове у таких, как мы, так часто бывает каша. Устаревающую информацию «в защитных мерах» стараемся стирать вместе с деталями, — чтобы просто не забивать мозг.

Вообще, конечно, сначала такой режим пугает. Многие коллеги, которые впервые приходят в онлайн-журналистику, или не выдерживают темпа, или не попадают в формат. Но тот, кто втягивается, — другой жизни и не представляет.

Работа заполняет мозг настолько, что даже снится. Лукашенко? Да он меня насильно привозил смотреть Дрозды! Путин? Приглашал на ужин в гостиницу «Орбита». Обама? Да мы с его женой чаи совместно пили! Собчак? Моя подружка. Сталин? Да я его вообще убила…

Естественно, такой ритм накладывает и отпечаток. Случаются выгорание, срывы… Благо, каждый научился преодолевать их по-своему, а коллеги к сбоям относятся с пониманием.

Иногда появляются и фобии. К примеру, боязнь отлучиться от компьютера даже на несколько часов, ведь порой пойдешь в магазин за продуктами, когда в столице тишина, а возвращаешься — уже при новом мэре Минска. Или боязнь дежурства в пятницу, поскольку, по наблюдениям, именно в этот день недели, ближе к вечеру, официальный лидер неожиданно оказывается в какой-то области с рабочим визитом или проводит разносное совещание. И начинает вещать, вещать… К таким моментам, благо, относимся с юмором: понимаем, что живем в стране, где скучать журналистам не приходится.

Еще один из минусов нашей работы, подразумевающей регулярное сидение у компьютера, — лишний вес. С каждым годом труда на онлайн-фронте моя «прекрасная часть» становилась все больше и больше. И никакие пилатесы и ограничения в еде, как ни старалась, не помогали.

В 2014-м увлеклась радикальным методом — лечебным голоданием. По две недели на одной воде в несколько заходов — и, о боги! — наконец, мое отражение меня порадовало. Другой вопрос, как пережил это мой шеф… Спасибо Саше Старикевичу — истерики и слезы, которые случались со мной с завидной регулярностью, он вынес героически.

…Пожалуй, вот так мне и удается зачастую избегать ляпов — благодаря коллегам, которые меня окружают, которые старательно работают в редакционном механизме, налаженном нами же, как часы. Благодаря творческим людям, которые не только являются профессионалами своего дела, но уже и членами семьи, чуткими психологами, друзьями. И это послание — мое признание им в любви.



Аргкамітэт Нацыянальнай прэміі беларускіх праваабаронцаў назваў імёны сёлетніх лаўрэатаў 10 снежня, у Дзень правоў чалавека.

За цыкл перадач «Свабода ў турмах» уганараваная журналістка Алена Панкратава. Прэмію ў галіне журналістыкі атрымаў таксама сайт праваабарончага цэнтра «Вясна» (арганізацыя пазбаўленая рэгістрацыі Міністэрствам юстыцыі Беларусі).

Праваабаронцам года прызнаная Алена Танкачова, прымушаная ўладамі да дэпартацыі з Беларусі. Адвакатам года названая Людміла Казак, што працуе ў Фрунзенскім раёне беларускай сталіцы.

Згодна з традыцыяй, лаўрэатаў прэміі супольна вызначаюць дзевяць беларускіх праваабарончых арганізацый, сярод якіх ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў», РПГА «БХК» і іншыя, — а таксама былыя атрымальнікі прэміі.







Фота:
Барыс Гарэцкі

Паводле кітайскага календара нас чакае год Сіняй (Зялёнай) Драўлянай Казы (Авечкі). Тым часам у Беларусі з'явіўся свой сімвал: птушкай 2015 года абвешчана вушастая сава (адпаведны конкурс правяла грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны»).

Традыцыйны «конкурс» напрыканцы года арганізавала і міжнародная праваабарончая арганізацыя Freedom House, далучыўшы Беларусь да краін «з несвабодным інтэрнэтам».

Але хто мае вушы — чуе, хто мае вочы — бачыць…

Пра вушастую саву ды парнакапытных

Уселася Сава Казе на рогі,
Адпачывае — праўда не ў нагах.
А нас чакаюць новыя дарогі,
Свой «непаўторны, беларускі шлях».

Па ім ішлі мы два дзесяцігоддзі.
Ці клыпалі — з надзеяй на святло?!
Ды толькі XXI стагоддзе
Заможнага жыцця не прынясло.

Дарагавізна. Праўда не ў пашане.
І журналісты церпяць пераслед.
Ды эканоміка ў непрытомным стане,
Ды «несвабодны беларускі інтэрнэт»…

Аднак, калегі, не губляйце веры
У справядлівасць, праўду і любоў,
Бо выкіне Сава з медыйнай сферы
Наглядчыкаў драпежных ды казлоў!

Уладзімір Дзюба

